жэраў, эканамістаў і іншых снецыялістаў перад праблемай выбару шляху далейшага развіцця рэспублікі, найбольш адэкватнага патэнцыяльным магчымасцям яе народа, яе культуры. Сацыялізацыя студэнтаў праз культуралагічную падрыхтоўку можа ажыццяўляцца на аснове рацыянальна вызначаных мэт жыцця, выбару адпаведных каштоўнасцей гэтага жыцця і фарміравання тых ці іншых сацыяльных патрэб і іх эмацыянальна-пачуццёвай накіраванасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ігнатовіч П.Р.,** *дацэнт*

## КУЛЬТУРА: СУТНАСЦЬ І МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Паняцце «культура» адносіцца да ліку фундаментальных у сучасным грамадазнаўстве. Цяжка назваць другое слова, якое мела б такое мноства сэнсавых адценняў.

Культура як шматаспектная праблема разглядаецца ў навуковай літаратуры надзвычай неадназначна, часам супярэчліва. Па падліках амерыканскіх культуролагаў Альфрэда Крэбера і Клайда Клакхона, з 1871 г. па 1919 г. было дадзена сем азначэнняў паняцця «культура». Адным з першых яны лічаць азначэнне англійскага гісторыка культуры XIX в. Эдуарда Бернета Тайлара ў яго кнізе «Першабытная культура». З 1920 года по 1950 год з'явілася яшчэ 157 азначэнняў гэтага паняцця. Зараз, па адных ацэнках, існуе больш за 500 азначэнняў культуры, па другіх — каля тысячы!

Такое мноства трактовак паняцця культуры можна растлумачыць перш за ўсё тым, што культура выражае глыбіню і

невымернасць чалавечай жыццядзейнасці. У той меры, у якой невычарпальны і рознааблічны чалавек, шматгранна, шматаспектна і культура. Акрамя таго, сам падыход да культуры шмат у чым абумоўлены ўстаноўкамі даследчыка. Культура з'яўляецца аб'ектам вывучэння не толькі культуролагаў, але і філосафаў, сацыёлагаў, гісторыкаў, археолагаў, этнографаў, аксіёлагаў і г.д. У залежнасці ад тэарэтыка-метадалагічных і метадычных падыходаў і выглядаецца, фармулюецца феномен культуры.

Паняцце «культура» настолькі шырокае, шматграннае, яно ўключае ў сябе такую колькасць разнародных кампанентаў, што абагульніць усё гэта багацце адной дэфініцыяй азначае альбо звузіць яго змест, альбо абмежавацца самай агульнай абстракцыяй.

Узнік тэрмін «культура» ў глыбокай старажытнасці.

У рымскай антычнасці ў паняцці «культура» падкрэслівалася фіксуемае ім адрозненне «чалавечай жыццядзейнасці ад біялагічных формаў жыцця». Першае значэнне тэрміна «культура» — апрацоўка («возделывание»), догляд. Канешне, аб'ектам такой апрацоўкі з'яўляецца ў першую чаргу зямля. Таму культура — гэта і апрацоўка поля, саду, і догляд за раслінамі і жывёламі. Найбольш звычнае ўжыванне паняцця «культура» ў дачыненні да выхавання і адукацыі. Культурны чалавек усім абавязаны адукацыі і выхаванню. Гэта і складае змест культуры ўсіх народаў, якія захоўваюць культурную пераемнасць і традыцыі як форму калектыўнага вопыту ва ўзаемадзеянні з прыродай.

Як сцвярджаюць даследчыкі, існуе сувязь паміж паняццямі «культ» і «культура». Культ — гэта павага, пашана, абагатварэнне. Культ продкаў у Егіпце, культ бацькі ў Кітаі, культ Сонца ў Старажытнай Русі былі важнымі (можна сказаць, «восевымі») элементамі жыццёвага ўкладу, і галоўным сярод іх быў культ рэлігійны. Гэта звязана з тым, што ў старажытнасці чалавек пастаянна знаходзіўся ў акружэнні багоў: ён сустракаўся з імі ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

полі і ў лесе, у зелені дрэў і рачных затоках. Богі «жылі» і ў горадзе, у доме чалавека. М.К.Рэрых слова «культура» расшыфроўваў як «пашана святла» (почитание света «культ» - почитание, «ур» — свет).

Хаця культура стала праблемай пазнання з моманту ўзнікнення філасофіі, афармленне культуралогіі як спецыфічнай сферы гуманітарных ведаў адносіцца да новага часу і звязана з філасофскімі канцэпцыямі гісторыі Дж.Віко (1668-1744), І.Гердэра (1744-1803), Г.В.Ф.Гегеля (1770-1831). Значны ўплыў на станаўленне і развіццё культуралогіі аказалі В.Дыльтэй, Г.Рыкерт, Э.Касірэр, О.Шпенглер. О.Шпенглер (1886-1936) — аўтар адной з самых нашумелых канцэпцый, якая выклікала шырокую грамадскую цікавасць да культуралогіі. Многія ідэі, канцэпцыі культуралогіі XX ст. звязаны з імёнамі З.Фрэйда, К.Г.Юнга, М.А.Бярдзяева, Н.Я.Данілеўскага, Э.Фрома, М.Вебера, А.Тойнбі, К.Ясперса, М.Хайдэгера, Ж.П.Сартра, Х.Артэга-і-Гасэта, К.Леві-Строса, П.Леві-Бруля, М.Бубера. Значны ўклад у развіццё культуралагічных ведаў унеслі Л.Ф.Лосеў, М.М.Бахцін, Д.С.Ліхачоў, С.С.Аверынцаў і інш. Сваё слова ў навуцы аб культуры сказалі нашы суайчыннікі Багдановіч, Цвікевіч, Абдзіраловіч.

Зараз слова «культура» ўжываецца ў штодзённым жыцці амаль кожнага чалавека. Але ў гэта паняцце ўкладваецца самы розны сэнс.

Культура — складаная сістэма, якая ўбірае ў сябе і адлюстроўвае супярэчнасці ўсяго свету. Гэта супярэчнасці паміж сацыялізацыяй і індывідуалізацыяй асобы (з аднаго боку, чалавек непазбежна сацыялізуецца, засвойваючы нормы грамадства, з другога, імкнецца захаваць індывідуальнасць сваёй асобы); паміж нарматыўнасцю культуры і той свабодай, якую яна дае чалавеку (норма і свабода — два полюсы, дзве спаборнічаючыя асновы); паміж традыцыйнасцю культуры і тым абнаўленнем, якое адбываецца ў ёй самой.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культуру звычайна дзеляць на дзве часткі: матэрыяльную і духоўную. Безумоўна, такое дзяленне часта бывае ўмоўным, наколькі ў рэальным жыцці матэрыяльнае і духоўнае цесна ўзаемазвязаны.

Трэба зазначыць, што матэрыяльная культура не тоесна ні матэрыяльнаму жыццю грамадства, ні матэрыяльнай вытворчасці, ні матэрыяльнай пераўтваральнай дзейнасці. Матэрыяльная культура характарызуе гэтую дзейнасць з пункту гледжання яе ўздзеяння на развіццё чалавека, раскрываючы магчымасць прымяніць яго здольнасці, творчы патэнцыял, таленты.

Духоўная культура выступае шматслойнай сістэмай і ўключае ў сябе пазнавальную, інтэлектуальную, філасофскую, маральную, прававую, педагагічную, рэлігійную культуру.

На думку некаторых культуролагаў, асобныя віды культуры нельга аднесці толькі да матэрыяльнай ці толькі да духоўнай. Яны ўяўляюць сабой «вертыкальнае» сячэнне культуры, «пранізваючы» ўсю яе сістэму. Гэта, перш за ўсё, эканамічная, палітычная, экалагічная, эстэтычная культура.

Зазначым, што яшчэ ў першай палове XX ст. было ўведзена чляненне культуры на тры сферы: культуру матэрыяльную, культуру сацыяльную і культуру духоўную. На гэта, дарэчы, указваюць Альфрэд Крэбер і Клайд Клакхон.

Пад матэрыяльнай культурай разумелася ўсё, што адносіцца да ўзаемаадносін чалавека з асяроддзем яго існавання, да задавальнення яго патрэбнасцей, да тэхналагічнага боку яго жыцця; пад сацыяльнай культурай разумеліся адносіны паміж людзьмі, сістэма статусаў і сацыяльных інстытутаў; пад духоўнай культурай — суб'ектыўныя аспекты жыцця, ідэі, устаноўкі, каштоўнасці і адпаведныя спосабы паводзін.

Але дзяленне культуры на тры часткі не прыжылося некалі ў савецкай грамадскай навуцы. І зараз у краінах СНД яно амаль што не ўжываецца навукоўцамі. Можна назваць некаторыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нясмелыя крокі асобных аўтараў (гл., напрыклад, Ионин Л.Г. Социология культуры. М., 1996).

Сустракаюцца і іншыя трактоўкі. Некаторыя аўтары падзяляюць культуру на матэрыяльную, палітычную і духоўную. У другім варыянце вылучаюцца матэрыяльная, духоўная і мастацкая культура. І ўсё ж большасць аўтараў падзяляе культуру на матэрыяльную і духоўную. Што датычыцца мастацкай, палітычнай, маральнай, эстэтычнай, прававой, экалагічнай, педагагічнай і іншых культур, то іх адносяць да першай ці другой з названых дзвюх.

Структура духоўнай культуры складаная і шматгранная. Яна ўключае сістэму адукацыі, навуку, мастацтва, літаратуру, міфалогію, мараль, палітыку, права, рэлігію. Пры гэтым усе элементы ўзаемадзейнічаюць, складаючы адзіную сістэму унікальнай з'явы.

Існуе мноства навук, якія засяроджваюць сваю ўвагу на вывучэнні (апісанні і аналізе) культуры. Большасць даследчыкаў культуры называюць такія навукі: этналогія, ці этнаграфія (мы будзем ужываць адзін тэрмін, хаця ёсць думка, што гэта дзве розныя навукі), культурная і сацыяльная антрапалогія, семіётыка культуры, філасофія культуры, тэорыя культуры, сацыялогія культуры, культуралогія. У залежнасці ад існуючых падыходаў сюды ж адносяць і філасофію, мовазнаўства, археалогію, мастацтвазнаўства, рэлігіязнаўства і інш.

Калі зыходзіць з высокай ступені абагульнення, можна сказаць, што этналогія (этнаграфія), культурная і сацыяльная антрапалогія — гэта сістэматычныя параўнальныя навукі аб культурах розных грамадстваў і розных эпох, якія грунтуюцца перш за ўсё на зборы і аналізе эмпірычнага матэрыялу. Адрозненне паміж імі не столькі ў сутнасці, колькі ва ўзроўні абстракцыі пры аналізе культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Семіётыка культуры засяроджвае ўвагу на спосабах кадзіравання, трансляцыі і выкарыстання культурнай інфармацыі ў сацыяльных каналах пры дапамозе знакава-сімвалічных схем.

Сацыялогія культуры — навука, якая разглядае сацыяльныя аспекты вытворчасці, захавання, распаўсюджвання і спажывання культурных каштоўнасцей, а таксама пабудову і функцыяніраванне культуры ў сувязі з сацыяльнымі структурамі і інстытутамі канкрэтнага гістарычнага перыяду.

Філасофія культуры — гэта вызначэнне падыходаў да вывучэння сутнасці, мэты і каштоўнасці культуры, умоў і форм яе праяўлення.

Аб суадносінах катэгорый «тэорыя культуры» і «культуралогія» гаворка будзе ісці ніжэй.

У апошнія гады шмат зроблена ў распрацоўцы праблем культуралогіі ў краінах СНД, перш за ўсё ў Расіі. Апублікаваны шэраг кніг, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў. Сярод іх — А.І.Арнольдаў «Уводзіны ў культуралогію» (М., 1993), В.С.Ерасаў «Сацыяльная культуралогія» (М., 1996), «Культуралогія» пад рэдакцыяй прафесара А.Н.Маркавай(М., 1995), «Культуралогія» пад рэдакцыяй прафесара Г.В.Драча (Растоў-на-Доне, 1995), «Культуралогія» пад рэдакцыяй прафесара А.Радугіна (М., 1996), Л.Г.Іонін «Сацыялогія культуры» (М., 1996), Л.Н.Коган «Сацыялогія культуры» (Екацярынбург, 1992).

Сёння на ніве навукі аб культуры працуюць вядомыя навукоўцы нашай рэспублікі: Я.М.Бабосаў, У.М.Конан, А.І.Мальдзіс, Э.К.Дарашэвіч Р.Я.Мінянкоў, В.В.Пазнякоў, В.А.Салееў, Г.І.Барышаў, М.І.Крукоўскі, Ю.М.Чурко, Р.Ф.Шаура, В.П.Пракапцова.

Відавочна, што культуралогія як навука XX веку не проста зводзіць у адно існуючую шматграннасць уяўленняў аб культуры і класіфікуе бясконцыя дэфініцыі. Яна грунтуецца на пэўнай традыцыі. Для еўрапейскай культуралогіі важнейшыя гістарычныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этапы гэтай традыцыі (гістарычнага развіцця уяўленняў аб культуры і яе разуменні) — антычнасць, сярэднявечча і новы час.

Станаўленне і развіццё адукацыі, якая спалучае ў сабе фундаментальную агульнанавуковую і спецыяльную падрыхтоўку з духоўным, мастацка-эстэтычным і маральным, грамадзянскім развіццём асобы студэнта, а таксама пераход на новыя арганізацыйныя і метадычныя прынцыпы выкладання прадметаў гуманітарнага цыкла, робяць неабходным прынцыповае змяненне месца і ролі культуралагічнай падрыхтоўкі ў сістэме вышэйшай адукацыі.

Важнейшае значэнне для станаўлення культуралогіі мае разуменне сутнасці культуры. Катэгорыя «культура» прыцягвала і прыцягвае многіх даследчыкаў глыбінёй свайго зместу і эўрыстычнай значнасцю. Шырыня грамадскіх з'яў, якія яна разглядае, замацавала за гэтым паняццем мноства сэнсавых адценняў, што ў кожны гістарычны час накладвае свой адбітак на разуменне і ўжыванне тэрміна «культура» у розных дысцыплінах. І ўсё ж-такі аналіз паказвае, што аб'яднальную аснову ў станаўленні культуралогіі трэба шукаць у багатых традыцыях еўрапейскай грамадскай думкі. Гэта дазваляе разглядаць у якасці элемента культуралогіі як сістэмы ведаў гістарычнае развіцце уяўленняў аб культуры (ад антычных да сучасных культуралагічных тэорый, канцэпцый), якія можна кваліфікаваць як адносна самастойныя накірункі).

Згодна з вядомай пастановай калегіі Міністэрства адукацыі «Аб стане гуманітарнай падрыхтоўкі ў вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь і мерах па яе ўдасканаленню» ад 23 верасня 1992 года, была распрацавана структура вышэйшай гуманітарнай падрыхтоўкі, у якой вызначаны базавыя блокі. Адзін з такіх блокаў — культуралагічная падрыхтоўка. Дарэчы, на гэты блок прапаноўвалася выдзеліць 100-120 гадзін вучэбнага часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што за гэты час зроблена? Мы прайшлі значны шлях наперад. Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы пры БДУ, які з'яўляецца галаўной тэарэтыка-метадалагічнай і метадычнай базай Міністэрства адукацыі, выдаў шэраг метадычных рэкамендацый і арганізаваў падрыхтоўку і перападрыхтоўку выкладчыкаў. У 1995 г. у сценах РІВШ былі распрацаваны адукацыйныя стандарты па вучэбных прадметах, у тым ліку і па культуралогіі (аўтарскі калектыў: Г.Я.Мінянкоў, В.В.Пазнякоў, І.Я.Шыршоў).

І хаця адукацыйныя стандарты пакуль існуюць толькі як праект — гэта вельмі важны крок ва ўдасканаленні падрыхтоўкі студэнтаў ВНУ.

Некалькі слоў аб адукацыйным стандарце па вучэбнаму курсу «Культуралогія». У адукацыйным стандарце культуралогія разглядаецца як сістэма навук аб культуры, якія вывучаюць апошнюю ў розных ракурсах. У стандарце падкрэсліваецца, што ў тэарэтычным аспекце яна ўключае:

1) тэорыю і гісторыю культуры;

2) культурную і псіхалагічную антрапалогію;

3) семіётыку культуры.

У так званую «перыферыйную галіну» культуралогіі аўтары ўключаюць: сацыялогію культуры, эканоміку культуры, менеджмент культуры.

Аднак на сённяшні дзень, нам здаецца, яшчэ не знойдзены дакладныя азначэнні паняццяў «культуралогія», «тэорыя культуры», «гісторыя культуры», «тэорыя і гісторыя культуры» і інш. Таму часам адно паняцце замяняецца другім. Напрыклад, вядомы культуролаг Э.В.Сакалоў у вучэбным дапаможніку «Паняцце, сутнасць і асноўныя функцыі культуры» піша: «Тэорыя культуры», ці культуралогія, — новая сацыяльна-гуманітарная галіна ведаў...» Многія выдадзеныя ў Расіі вучэбныя дапаможнікі пад назвай «Культуралогія» хоць і сцвярджаюць, што культуралогію трэба разумець як комплекс (сістэму) навук аб культуры, уключаючы ў яе гісторыю і тэорыю культуры. Калі «тэорыя культуры»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і «культуралогія» — гэта ідэнтычныя паняцці, навошта тады ўжываць абедзве дэфініцыі?

Мы мяркуем, адбываецца гэта таму, што яшчэ не ўсталяваўся строгі навуковы падыход да гэтай праблемы. Безумоўна, пошукі карэктнага падыходу — працэс аб'ектыўны, і ён дасць свой плён.

**Печанко М.Ф.,** *дацэнт*

## ІНТЭЛІГЕНТНАСЦЬ ЯК ФЕНОМЕН КУЛЬТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод праблем культуралагічнага зместу праблема інтэлігентнасці, духоўнасці, несумненна, з'яўляецца адной з найгалоўнейшых. Яна ў роўнай меры датычыцца і культурнай палітыкі, і адукацыі, і выхавання, і сферы паўсядзённага жыцця.

Перш чым змястоўна раскрыць абазначаную з'яву, варта даць некалькі дэфініцый, якія з розных пунктаў гледжання дазваляюць раскрыць сутнасць паняцця інтэлігентнасці. У даведачна-энцыклапедычнай літаратуры пануе, галоўным чынам, навукова-рацыяналістычны змест паняцця «інтэлігентнасць». Яно вызначаецца як вышэйшы ўзровень развіцця інтэлекту, як адукаванасць ці высокая культура паводзін. Гэта тлумачыцца тым, што дух, духоўнасць, інтэлігентнасць, адукаванасць у еўрапейскай філасофскай традыцыі (пачынаючы з часоў Асветніцтва і асабліва ў нямецкім ідэалізме) разглядаліся ў пазнавальным ключы як адносіны свядомасці да рэчаіснасці. Так, у Гегеля пад інтэлігентнасцю разумеецца пазнанне, розум, інтэлект. Таму інтэлігентнасць у гэтым сэнсе выражала сабой разумовую, інтэлектуальна-духоўную дзейнасць суб'екта пазнання і ведаў, іх ступень развіцця, атрыманую праз адукацыю.

Зразумела, што інтэлігенцыя па сутнасці сваёй з'яўляецца носьбітам духоўнай традыцыі і ўключаецца ў культурна-